3. Мариненко, О.П. Педагогическая поддержка иностранных студентов на этапе предвузовской подготовки: дисс. … канд. пед. наук: 13.00.01 / Мариненко Ольга Петровна; Витебский государственный университет имени П. М. Машерова. – Витебск., 2012. – 205 с.

4. Фисоченко, О. Н. Математическое и программное обеспечение для поддержки принятия решений при управлении процессом адаптации иностранных студентов российских вузов: дисс. ... канд. тех. наук: 05.13.10. / Фисоченко Оксана Николаевна. – Томск, 2017. – 196 с.

5. Ле Ву Хыонг Занг Модели и алгоритмы управления качеством подготовки иностранных студентов на основе интеллектуальных методов принятия решений: дисс. ... канд. тех. наук: 05.13.10 / Ле Ву Хыонг Занг. – Воронеж, 2019. – 131 с.

***УДК 378.147:392.1(476)***

***В. С. Новак, А. А. Кастрыца***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

## ДА ПРАБЛЕМЫ ВЫВУЧЭННЯ РЭГІЯНАЛЬНА-ЛАКАЛЬНАЙ СПЕЦЫФІКІ СЯМЕЙНА-АБРАДАВАГА ФАЛЬКЛОРУ ПРЫ ПРАВЯДЗЕННІ ЗАНЯТКАЎ ПА ФАЛЬКЛАРЫСТЫЦЫ: МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННАЙ АБРАДНАСЦІ

Сямейна-абрадавы комплекс беларусаў уключае радзінна-хрэсьбінныя, вясельныя і пахавальныя абрады і звычаі. Радзінна-хрэсьбінная абраднасць беларусаў – той від мастацтва, які ўтрымлівае ў сабе іх сямейныя каштоўнасці, правілы народнай педагогікі, прымхі і забабоны, важныя для разумення светапогляду, мудрыя парады і паэтычныя асаблівасці ўспрымання свету. Абазначаную ў назве артыкула праблему нельга вырашыць без даследавання асобных відаў сямейнай абраднасці на канкрэтным фактычным матэрыяле, запісаным у розных населеных пунктах таго ці іншага раёна, напрыклад, Гомельскай вобласці. Вызначэнне агульнаэтнічнай асновы і выяўленне адметных мясцовых рысаў абрадавых з’яў – важная задача выкладчыка дысцыпліны “Фалькларыстыка” пры азнаямленні з рознымі відамі сямейнай абраднасці. Глыбіня асэнсавання студэнтамі канцэпцыі рэгіянальна-лакальнага даследавання фальклорных традыцый у дадзеным выпадку абумоўлена выбарам у якасці аб’екта разгляду аднаго з відаў сямейнай абраднасці на аснове аўтэнтычнага фальклору пэўнага раёна. У гэтых адносінах варта адзначыць, што ў сістэме рэгіянальна-лакальных традыцый радзінна-хрэсьбіннай абраднасці Гомельшчыны важнае месца адводзіцца абрадам, звычаям і песням Лельчыцкага раёна. З фактычнага матэрыялу, які разглядаецца са студэнтамі на практычных занятках, вынікае магчымасць вылучыць не толькі пэўныя структурныя кампаненты, характэрныя для агульнабеларускай радзінна-хрэсьбіннай традыцыі, што маюць месца і ў лакальных фальклорна-этнаграфічных апісаннях, а таксама і спецыфічныя мясцовыя асаблівасці, што выяўляюцца як на ўзроўні структуры абраду і звязаных з яго кампанентамі прыкмет і павер’яў, так і ў вербальным суправаджэнні абрадавых дзеянняў. Як і ў іншых раёнах Гомельскай вобласці, дародавы перыяд у радзінна-хрэсьбіннай абраднасці Лельчыцкага раёна быў напоўнены шматлікімі міфалагічнымі ўяўленнямі, якія знайшлі рэалізацыю ў надзвычай цікавых прыкметах і павер’ях, прагматычных парадах, адвечных правілах і засцярогах (забаронах) для цяжарнай жанчыны.

Галоўнае, што хвалявала цяжарную жанчыну, гэта, па-першае, захаванне здароўя немаўляці, па-другое, прадухіленне ў будучым праяўлення ў дзіцяці адмоўных рысаў характару, па-трэцяе, засцярогу немаўляці ад няшчасных у жыцці выпадкаў. Звернемся да аўтэнтычных экспедыцыйных матэрыялаў, якія закранаюць першую групу прыкмет і павер’яў, што з’яўляюцца найбольш распаўсюджанымі на тэрыторыі Лельчыцкага раёна. Напрыклад, паводле ўспамінаў жыхароў з вёскі Букча, забаранялася жанчыне-парадзісе

штурхаць нагой ката, сабаку, інакш на целе дзіцяці могуць застацца сляды («Ей нельзя дажа нагой піхнуць, ні сабаку, нічога – астаюцца як бы знакі ў дзіцёнка на целе» (запісана ад Ягорскай В. У., 1966 г. н., Алесіч М. Е., 1938 г. н.). У гэтай жа мясцовасці забаранялася пераступаць праз правады, што ляжалі на зямлі або яшчэ дзе-небудзь: «Счас правада этыя вездзе і кабеля, і інтэрнэт, нільзя этыя правада жэншчыне пераступаць – дзіцёнак будзе пупавінай абкручаны» (запісана ў в. Букча ад Баланчук Н. А., 1968 г. н). Клопатам пра здароўе немаўляці і яго знешні выгляд былі абумоўлены і наступныя адметныя правілы, якімі павінна была кіравацца жанчына-парадзіха: «Не можна піць воду з ведра – у дзіцяці будзе сіня пераносіца»; «Не можна выліваць воду праз парог – у дзіцяці будзе цекці слюна», «На святы нельга родзічам што-небудзь рубаць – дзіця народзіцца з «заячай» (рассечанай) губою» (в. Дуброва) [1, с. 251].

Даўней, як пацвердзілі жыхары, тэрмін родаў захоўвалі ў тайне, што было звязана з верай у лёгкія роды: «Калі наступаюць роды, стараліся, каб менш людзей зналі, для таго каб лягчэй прайшлі роды» (в. Дуброва) [1, с. 251].

Каб забяспечыць лёгкія роды жанчыны-парадзіхі, трэба было выконваць пэўныя магічныя дзеянні: «Для лягчэйшых родаў у парадзіхі расшпільвалі гузікі, распляталі косу» (в. Дуброва) [1, с. 251]; «Для аблягчэння родаў трэба развязваць усе вузлы, расчыпіць усе гузікі, адкрыць усе замкі» (запісана ў в. Дзяржынск ад Бабовіч К. В., 1938 г. н.). Паводле сведчанняў мясцовых жыхароў, бабка-павітуха прымала роды: «Калі вона ўжэ прымае роды і перевяжэ пуповіну, то она носіла тры дня пудрад роженіцы суп, екі бабка варыла з сухімі чарніцамі і пшоном. Роженіца доўжна ўсёй суп з’есці» (запісана ў в. Мілашавічы ад Пятрычыц В.Л., 1922 г. н.).

Выбар хросных бацькоў нованароджанага – важная задача, якую павінны былі своечасова вырашыць маці і бацька немаўляці: «За кумоў бралі як сваіх, так і чужых людзей» (в. Дуброва) [1, с. 251]. Як паведамілі жыхары з вёскі Дзяржынск, калі ў маладой сям’і была праблема з нараджэннем дзяцей, то запрашалі ў кумы незнаёмых людзей, тых, якіх сустракалі на сваім шляху першымі: «Кумоў бярэш, хто тобе нравіцца, з кім дружыш, а еслі ў цебе дзеці не вядуцца, то ідзёш к стрэчным» (запісана ў в. Дзяржынск ад Лукашэвіч Г. М., 1938 г. н.).

Звычайна рытуал запрашэння кумоў выконвалі самі бацькі нованароджанага, якія павінны прыйсці з хлебам, загорнутым у ручнік: «Яны бралі хлеб, загортвалі ў ручнік і неслі паважаным людзям, тым самым запрашалі іх стаць хроснымі бацькамі іх дзяцей (дзіцяці), і калі тыя бралі хлеб, то значыць яны згаджаліся» (в. Казлоўка) [1, с. 252]; «За хросных бралі, каго хочаш. Мужчына первы раз должэн быў хрысціць дзевочку, а жэншчына – мальчыка. Гэта для шчасця рабілі, гаварылі ў нас так» (запісана ў в. Дубніцкае ад Парды А. Г., 1928 г. н.).

Пасля вяртання хросных бацькоў з нованароджаным з царквы пачыналася святкаванне хрэсьбін, дзе пачэснае месца за сталом адводзілася менавіта куму, куме, бабцы-павітусе, якая рыхтавала абрадавую страву – кашу.

Самы важны момант на хрэсьбінах – гэта абрад разбівання гаршка з кашай. Звычайна гэтай пачэснай місіі быў уганараваны кум, які, як было прынята ў народзе, больш за іншых клаў грошай на кашу: «Потым амаль у канцы свята, кум браў гаршок з бабінай кашай і разбіваў. Кашу дзялілі на ўсіх» (в. Глушкавічы) [1, с. 250]. Як адзначылі мясцовыя жыхары, «да кашы абавязкова падавалі мёд, каб жыццё немаўляці было такім жа салодкім, як гэты мёд» (в. Букча) [1, с. 249]. Магічнымі, паводле народных вераванняў, былі чарапкі ад разбітага гаршка з кашай, семантыку якіх звязвалі з прадукавальнай магіяй – звышнатуральнай здольнасцю ўплываць на нараджэнне дзяцей. У розных вёсках выконвалі адметныя дзеянні з чарапкамі, аднак агульным было такое дзеянне, як іх кіданне: кідалі дзяўчатам, каб знайшлі сваіх суджаных («Черепкі кідаюць у пелену дзеўкам, каб яны хутчэй ішлі замуж» (запісана ў в. Грабяні ад Саўрасавай А. П., 1940 г. н.)), кідалі «маладым парам, штоб у ніх тоже дзеткі скарее былі» (запісана ў

в. Букча ад Алесіч М. Е., 1938 г. н.)), перакідваліся іншы раз госці паміж сабой гэтымі чарапкамі («Асколкі з гаршка госці кідаюць адзін на аднаго (за баку)» (запісана ў в. Глушкавічы ад Зубрэй Н. В., 1945 г. н.)); кідалі маладым жанчынам «у пелену, каб да году раджалі дзяцей» (в. Дуброва) [1, с. 251] і інш.

Госці, як правіла, напрыканцы хрэсьбіннага застолля не толькі частаваліся кашай, але і адорвалі грашыма нованароджанага, пры гэтым прыгаворвалі розныя пажаданні, адрасаваныя яму. Што да пажаданняў, то змест адрасаваных немаўляці славесных формул меў і гаспадарчую скіраванасць («Пашлі, Божанька, каб наш сыночак бальшы вырас і шчасліненькі быў. Пашлі, Божанька, ды ў еты дамок хлеб ды соль, дык у полі штоб копамі, а на лузе штоб стогамі, а ў амбары штоб карабамі, на гумне штоб варахамі, а ў печы штоб пірагамі» і выхаваўчую («Няхай уважае, сынок, зярнятка, штоб было і людзям, і ў сваю хатку» (запісана ў в. Сініцкае Поле ад Сыцько Н.М.).

Прыведзеныя матэрыялы па радзінна-хрэсьбінных абрадах і звычаях дазваляюць сцвярджаць факт непаўторнага багацця вар'іравання семантыкі рытуальных дзеянняў, прадметнай атрыбутыкі і вербальнага суправаджэння ў лакальных традыцыях Лельчыцкага Палесся і з'яўляюцца надзвычай карысным і цікавым матэрыялам, неабходным для асэнсавання студэнтамі важнай тэарэтычнай праблемы ў фалькларыстыцы – канцэпцыі рэгіянальна-лакальнага вывучэння абрадавага фальклору. Менавіта выяўленая сістэма лакальных традыцый узбагачае агульнаэтнічную аснову вуснай народнай творчасці беларусаў.

*Выкарыстаны матэрыялы навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры рускай і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны».*

## Літаратура

1. Новак, В. С. Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклора Гомельскай вобласці) / В. С. Новак, В. К. Шынкарэнка, А. А. Кастрыца, А. М. Воінава, С. А. Вяргеенка, А. М. Палуян, А. У. Партнова-Шахоўская. – Гомель: Барк, 2013. – 380 с.

***УДК 37.014.6-057.874***
***Н. Г. Новак, В. А. Бейзеров, Ю. В. Никитюк***
*г. Гомель, ГГУ имени Ф. Скорины*

## МЕЖВЕДОМСТВЕННОЕ ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ ПО ПОВЫШЕНИЮ КАЧЕСТВА ПРОФИЛЬНОГО ОБУЧЕНИЯ ШКОЛЬНИКОВ

Интенсивное развитие в нашей стране института профильного обучения связано с ориентацией системы образования на обеспечение права каждого человека на образование, при этом не должно быть ограничений относительно персональных приоритетов, способностей, вектора профессиональной самореализации. Осуществление данной деятельности регламентируется Кодексом Республики Беларусь об образовании, нормативными документами Министерства образования и другими нормативно-правовыми и законодательными актами.

В настоящее время на базе учреждений общего среднего образования Беларуси действуют профильные классы следующей направленности: аграрная, военно-патриотическая, инженерная, педагогическая, спортивно-педагогическая, технико-технологическая. Совершенствуются нормативно-правовые документы и принципы организации и